КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 1 (1179) 3 студзеня 2015 г.

ДВАНАЦЦАЦЬ МЕСЯЦАЎ ТРАДЫЦЫЙ

Па добрым звычаі, першы нумар года ў газеце "Культура" — каляндар. Сёлетні, прысвечаны адроджаным строям розных рэгіёнаў Беларусі, рэдакцыя рабіла сумесна с абласнымі метадычнымі цэнтрамі, якія дапамаглі нам у пошуку ілюстрацый і апісанняў касцюмаў.

9 — 10 студзеня пройдзе Ражджэсцвенскі праваслаўны фестываль батлеечных і лялечных тэатраў **"Нябёсы"**.

Народны каляндар — гэта сістэма сталых ці рухомых святаў, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, звычаяў, што замацаваны ў побыце і фальклоры. Гэта, пераважна, спалучэнне язычніцкай і хрысціянскай культур. Ён уключае традыцыйныя арыенціры (хранонімы) на сельскагаспадарчыя работы ды адпачынкі ў гадавым, сезонным, месячным і іншых цыклах-рытмах. Утрымлівае традыцыйныя феналагічныя, метэаралагічныя, агранамічныя, астранамічныя, астралагічныя ды іншыя каляндарныя веды, атрыманыя пераважна шматгадовым досведам.

Беларускі народны каляндар на 2015 год

СТУДЗЕНЬ

1. ч. Новы год. ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 г., Расія — з 1700 г.

6. а. Першая, Посная куцця. Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. ***Тры Каралі.*** Каталікі праводзілі маскіраваны абрад "Тры Каралі", або "Гэроды".

7. с. Ражджаство Хрыстова. Пачатак **Каляд.** "Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі…". Калядавалі. Насілі "звязду". Паказвалі батлейку. На Каляды праводзілі ігрышчы ("вадзілі казу", "жанілі Цярэшку", "пяклі ката", гулялі ў "Яшчура" і інш.).

9. пт. Сцяпан. "На святога Сцяпана слуга вышэй за пана".

13. а. Шчодрая куцця. Пачатак **Шчодрага тыдня.** "Мароз, хадзі куццю есці".

14. с. Васілле. Новы год па юліянскім календары. "Сею, сею пасяваю, з Новым годам вас вітаю!"

18. н. Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця. Апошнія дні Каляд. "Каляда ад'язджае".

19. п. Вадохрышча (Хрышчэнне). "Святое Кшчэнне ваду ксціла…, свет ачысціла і ваду наверх пусціла"; "На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама".

20. а. Прывадохрышча — заканчэнне Каляд. Пачатак **Малой вясельніцы** (да посту).

24. сб. *Аксіння.* "Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце". **Фядос.** "На Фядоса цёпла".

25. н. Таццяна. Свята студэнтаў. ***Павел.***

31. сб. Апанас, Гусінае свята. Свята свойскай жывёлы. "Хавай нос у апанасаўскі мароз".

ЛЮТЫ

1. н. *Ігнат.* "На святога Ігната зіма багата".

2. п. *Грамніцы, Стрэчанне.* "Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы"; "Грамніца — хлебу палавіца...".

5. ч. *Агата.* Каровіна свята. "Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты".

6. пт. Аксіння Паўзіміца. "На Аксіні мяце". ***Дарота.*** "Па Дароце высахнуць хусты на плоце".

8. н. *Памінальніца. Памінальны тыдзень. Калі "вея" ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі "дзесяцінкі дзве".

11. с. Ігнат. "Ігнат Грамніцам рад".

13. п. *Дзедава пятніца.

14. сб. Трыфан. "На Трыфана зорна — вясна позняя". ***Валянцін.*** Свята закаханых. ***Масленыя Дзяды (Бабы).** "Дзяды не зналі бяды, а нашы ўнукі зазналі мукі".

15. н. Грамніцы, Стрэчанне. "Зіма з летам сустракалася..."; "На Грамніцы — палавіна зіміцы". ***Рабы тыдзень, Малая вясельніца, Развітальны, Сырапусны тыдзень.** Тыдзень перад Масленкай. Які добры дзень на Масленным тыдні, у той дзень ад Ільі сеялі лён. Дзяўчаты вешалі "калодкі" нежанатым хлопцам.

18. с. Агата. Каровіна свята. ****Серада Папяльцовая*** (пачатак Вялікага посту ў каталікоў). ***Лысая серада.** Праталіны-залысіны.

19. ч. *Блакітны чацвер. Тумановы дзень. ***Крывы, Тлусты чацвер, Валосы, Валосся.** Свята жывёлы. "На Валосага бліны пяклі або аладкі, каб былі валы гладкі".

22. н. *Масленка. "Масленка ў "вятху" (пасля поўні) — дзяржы пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу на ўсю руку". **Гуканне вясны.** "Блаславі, Божа, зіму замыкаці, вясну загукаці". На Палессі вадзілі карагоды, "спявалі чырачку", насілі ёлку з вянком.

23. п. *Паласказуб. Першы дзень Вялікага посту. Паласкалі зубы гарэлкай.

24. а. Улассе. Свята жывёлы. "Аўлас на сыры лас". ***Мацей.*** "На Мацея дарога пацее", "На Мацея адліга — будзе мароз".

25. с. Уступная серада. Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, хадзілі ў карчму і перескоквалі цераз пень.

26. ч. Фаціння. Заступніца ад хвароб.

28. сб. *Зборава субота. Абрад "споведзі дзежкі".

29. н. *Зборніца, Ізбор. Пачатак збору ў поле. "А святы Ізбор — бяжыць вада з гор".

САКАВІК

4. с. *Казімір.* "Святы Казімір дровы сякець".

9. п. Янка, Паўраценне. Мядзведзь паварочваецца ў бярлозе на другі бок.

12. ч. *Рыгор.* "На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора".

13. пт. Васіль Капальнік. Са стрэх капае.

14. сб. Аўдоцця Вясноўка. Гуканне вясны. "На Аўдокі голы бокі". (1 сакавіка — Новы год у мінулым, сакавіцкі каляндарны стыль.)

15. н. Хвядот. "На Хвядота занос — усё сена знясе".

16. п. *Пачатак **Храстовага тыдня.** Пяклі "храсты". Засеўкі. Абрад "жаніцьбы коміна".

17. а. Герасім Гракоўнік. "Герасім гракоў прыгнаў".

18. с. *Серадапосце. Выпякалі "храстцы".

19. ч. *Язэп.* "Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту"; "На Язэпа пагода — год ураджайны".

21. сб. *Вясновае раўнадзенства. Усход 6.16, захад 18.18. Маладзік.*

22. н. Саракі. Свята птушак. Прылятае сорак выраяў. "Святыя Саракі ў поле саху валаклі". **Прыска.** "На святога Прыску праб'е лёд і пліска".

23. п. Пачатак **Пахвальнага тыдня.** "Дзікая качка яйцом пахваліцца".

25. с. Рыгор. "На Рыгора зіма ідзе ў мора". ***Дабравешчанне, Звеставанне.*** "І птушка гнязда не кладзе". Прылёт бусла. Гуканне вясны.

26. ч. Міжблагавешчыны (да 7 красавіка). Забарона на "запасванне" кароў.

27. пт. *Пахвальная пятніца. Мыццё дзежак.

28. сб. *Пахвальная субота. Не грымелі кроснамі, каб гром не грымеў.

29. н. ****Пальмова нядзеля.* "Вярба б'е, не я б'ю".

30. п. Аляксей Цёплы. Дзень рыбалова. "На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова — на верас, а бортнік — на хвою". Пачатак ***Вербнага, Белага, тыдня. *Чысты, Блакітны, панядзелак.**

КРАСАВІК

1. с. Дар'я Вясенняя. Адбельвалі палотны.

5. н. ****ВЯЛІКДЗЕНЬ* (у каталікоў). ***Вербніца. Арына.** "На Арыну сей капусту ў расадніках".

6. п. Камаедзіца. Свята мядзведзя. **Благавеснік.** Пяклі пірагі "буславы лапы". Пачатак ***Белага, Вялікага, тыдня. *Чысты панядзелак.** Бялілі і мылі ў хаце.

7. а. Благавешчанне. "Благавешчанне без ластавак — халоднае лета". Абрад "Страла". ***Чысты аўторак.** Каб на людзей і "гаўядо" не напала "парша", трэба ўсё мыць.

8. с. Благуста. "На Благусту сей капусту". ***Дравяная страсць.** Мыюць усё драўлянае.

9. ч. Матрона. "На Матрону шчупак хвастом лёд разбівае". ***Чысты чацвер.** Лазня. Абрад мыцця дзежкі.

10. пт. *Чырвоная, Велікодная, пятніца. Сеялі гарох.

11. сб. *Вялікая, Чырвоная, субота. Фарбавалі яйкі. Канец Вялікага посту.

12. н. *ВЯЛІКДЗЕНЬ (у праваслаўных). "Хрыстос уваскрос!" — "Сапраўды ўваскрос!".

13. п. Працяг ***Велікоднага тыдня.** "Першы дзень пірагі маюць, сярэдні — пагуляюць, а паследні дзень выпраўляюць".

14. а. Прабуджэнне хатніка. Мар'я. Калі ў ясную ноч прыбывала вада, то суха будзе ў жніво на хлебнай ніве.

15. с. Палікарп. Пачатак бясхлебіцы. ***Градавая серада. Праводны, Мёртвы, тыдзень.** "Пайшла зіма да Кіева, а лета нам пакінула".

16. ч. Мікіта. "Калі на Мікіту крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбаловам".

19. н. *Праводная нядзеля. "Ідзі, зіма, да Кучава! Як ты нам надакучыла!"

21. а. Руф. Руф рушыць снягі.

23. ч. *Юр'я.* (Новы год па задыяку). "Як зязюля закукуе за 12 дзён да Юр'я на "голы" лес, то не чакай ураджаю і будзе хварэць жывёла". ***Войцах.*** "Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху".

24. пт. Анціп — ахоўнік зубоў.

25. сб. *Марк.* "Дождж на Марка — дык зямля як шкварка".

27. п. Радаўнічныя Дзяды.

28. а. *Радаўніца. "На Радаўніцу да абеду пашуць, па абеду плачуць, а к вечару скачуць". **Пуд.** "Пуд снег пугне".

29. с. Арына. "На Арыну сей капусту".

30. ч. Зосім — ахоўнік пчол. **Андрыянава ноч, Андрэй.** Ноч дзявочай варажбы і чараўніцтва.

МАЙ

1. пт. Кузьма. "Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом — з гурком".

3. н. *Міраносіцы. "На Міраносця п'яныі бабы цігаюць адна адну за валосця".

4. п. Пачатак ***Пераплаўнага, Чарвівага, тыдня.** Не трэба садзіць, бо заядуць чэрві.

5. а. Ляльнік. Свята Лялі — дачкі Лады.

6. с. Юр'я. Свята жывёлы. "Як дождж на Юр'я — хлеб будзе і ў дурня". Абрад "Страла". ***Градавая, Пераплаўная, серада.** Засцярогі ад граду і дажджу.

7. ч. Алісей. "Прыйшоў Алісей — авёс пасей". **Бабскія розбрыкі.** Скокі жанчын і качанне па зямлі дзеля ўрадлівасці.

8. пт. Марк. "Дождж на святога Марка — дык зямля, як шкварка". ***Станіслаў.*** "Сей лён на Станіслава — вырасце як лава".

10. н. Ярылавіца. Свята Ярылы.

13. с. Якуб. "На Якуба грэе люба".

14. ч. ****Ушэсце.* Унебаўшэсце пана Езуса. Свята агляду жыта. **Макарэй.** Абрады ля вады.

15. пт. Барыс. Апякун поля і жывёлы. ***Градабойцы, Ледавіты дзень.**

18. п. Арына Расадніца. Дзень высаджвання расады ў Паазер'і.

20. с. Антоній. "На святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца — дык і прадасца".

21. ч. *Ушэсце. Абрад "Страла". **Іван Веснавы.** Апякун земляроба. "На Івана — каласок, а на Пятра — піражок".

22. пт. Мікола Веснавы. Свята пастухоў. ***Алена.*** "Сей лён на Алену: будзе кашуля па калена".

23. сб. Зілот. "Сей пшаніцу на Зілота, і яна будзе як золата".

У народным календары на 2015 год прадстаўлены асноўныя святы і прысвяткі з кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі і г. д. Дні, якія адзначаюць беларусы-каталікі, выдзелены курсівам. У праваслаўных яны замацаваны за старым, юліянскім, календаром, што мае 13 лішніх дзён. Зорачкай /*/ пазначаны святы "рухомай" царкоўнай пасхаліі.

Умоўныя абазначэнні: п — панядзелак, а — аўторак, с — серада, ч — чацвер, пт — пятніца, сб — субота, н — нядзеля. Даўжыня дня і моманты ўсходу і захаду падаюцца для Мінска. Больш падрабязна пра значэнне хранонімаў календара можна прачытаць у нашай кнізе "Беларускі народны каляндар" (Мінск, 2002).

Працяг народнага календара **чытайце на старонцы 15.**

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ.
Адказны сакратар: Вольга НАВІЦКАЯ; **рэдактары аддзелаў:** Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Аліна САЎЧАНКА; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Інга ЗЕЛЬГІС.
Сайт: **www.kimpress.by** E-mail: **kultura@tut.by**
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва" 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2014. Наклад 6314. Індэксы 63875, 638752.
Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 31.12.2014 у 12.00. Замова 75.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Увага! Аб'ява!*

Установа адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў"

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:

— прафесар кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў;
— загадчык кафедры кінатэлеаператарства;
— прафесар кафедры кінатэлеаператарства;
— дацэнт кафедры сцэнічнай мовы і вакалу;
— старшы выкладчык кафедры менеджменту, гісторыі і тэорыі экранных мастацтваў;
— старшы выкладчык кафедры фізвыхавання.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Заявы і дакументы, згодна з Палажэннем аб конкурсе, падаваць на імя рэктара Акадэміі на адрас: 220012, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 81, аддзел кадраў; тэлефон: 292-77-34.

Гомельшчына
Веткаўскі раён

Неглюбскі строй — адна з цудоўных мастацкіх з'яў традыцыйнай культуры Падняпроўя. Перад вамі — святочны жаночы касцюм (комплекс з панёвай: "сарочка", панёва, фартух, пояс, "запіна", "чапец", "платок", комплекс традыцыйных упрыгожанняў) і адзенне дзяўчынкі (сарочка, пояс, паясное адзенне "калышка") першай паловы XX стагоддзя. Навуковая рэканструкцыя выканана Ірынай Смірновай з Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Фота Міхася і Кацярыны АРАКЧЭЕВЫХ

СТУДЗЕНЬ **2015**

ПН	АЎТ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НДЗ
			1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	11
12	13	14	15	16	17	18
19	20	21	22	23	24	25
26	27	28	29	30	31	

ЛЮТЫ 2015

ПН	АЎТ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НДЗ
						1
2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	

Гомельшчына
Лельчыцкі раён

Удзельнікі народнага фальклорнага калектыву “Таняжанка” Тонежскага сельскага дома культуры Лельчыцкага раёна выступаюць ва ўласнаручна зробленых строях. Традыцыйны для дадзенай мясцовасці жаночы касцюм складаецца з кашулі, гарсэта, спадніцы, фартуха і хусткі.

На фота Алега БЕЛАВУСАВА — фальклорны гурт “Таняжанка” пад час традыцыйнага свята “Чырачка”, прысвечанага прылёту і сустрэчы птушак, што праводзіцца ў апошнюю нядзелю перад Вялікім постам.

Міншчына

Барысаўскі раён

Гэтыя строі былі адноўлены ў 2011 годзе па выніках даследчай працы метадыста па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Аксаны Кокшынай і метадыста па фальклоры Аліны Осіпавай Цэнтралізаванай клубнай сістэмы Барысаўскага раёна. На падставе экспедыцыйнай працы высветлілася, што традыцыйны касцюм рэгіёна вельмі разнастайны: дзесьці насілі цёмныя спадніцы, дзесьці — светлыя, дзесьці без кабата (безрукаўкі) не хадзілі, а дзесьці пра яго нават не згадвалі. Больш поўна былі сабраны звесткі пра Мётчанскі строй (сялянскі святочны). Матэрыялы сучасныя фабрычныя, але крой адпавядае традыцыям 1940 — 1950-х. Упрыгожаны строі ручной вышыўкай крыжыкам у чырвона-чорнай колеравай гаме майстрыхай-вышывальшчыцай Н.А. Дударонак (1957 года нараджэння, вёскі Забашавічы). Комплексы касцюмаў уключаюць: жаночы — 5 прадметаў, галаўны ўбор і абутак; мужчынскі — 6 прадметаў, галаўны ўбор і абутак.

На фота, прадастаўленых Мінскім абласным цэнтрам народнай творчасці: у строях — Іна Ганчарова і Уладзімір Малахоўскі.

САКАВІК 2015

ПН	АЎТ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НДЗ
						1
2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	29
30	31					

КРАСАВІК 2015

ПН	АЎТ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НДЗ
		1	2	3	4	5
6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30			

Брэстчына
Ганцавіцкі раён

Традыцыйны касцюм на тэрыторыі сучаснага Ганцавіцкага раёна ўвабраў у сябе асноўныя рысы лунінецкага строю, які, у сваю чаргу, з'яўляецца прыкладам стылёвага пераходу ад заходнепалескіх да ўсходнепалескіх традыцый. Асноўны комплекс жаночага строю складалі сарочка, спадніца (андарак), гарсэт, ільняны ці паркалёвы фартух, пояс.

Аснову традыцыйнага геаметрычнага арнаменту тканін рэгіёна, як і беларускіх тканін наогул, складаюць элементы, якія адлюстроўваюць раннія ўяўленні чалавека пра светабудову. Але, захоўваючы сюжэтна-кампазіцыйную абалонку і набор асноўных модуляў, традыцыйны арнамент пераўтварыўся ў дасканала распрацаваную мастацкую сістэму. Арнамент стаў выдатным узорам традыцыйнага мастацтва і надаў касцюму завершаны мастацкі вобраз.

Фота прадастаўлена Ганцавіцкім домам рамёстваў

Гродзеншчына

Гродзенскі раён

Напрыканцы XIX — на пачатку XX стагоддзя жаночы касцюм складаўся з кашулі, традыцыйнага андарака ў клетку ці палоску альбо спадніцы, шытай на гарадскі манер з шасці кліноў. Гарсэт — чорнага колеру. Завяршалі касцюм фартух і галаўны ўбор. Кашуля паліковага крою аздабляла-ся вузкім пасам вышыўкі па краю паліка. Спадніца, часцей цёмнага колеру, шылася ў шэсць кліноў. Па нізе нашываліся паскі чорнага аксаміту. Чапцы шылі з чырвонага, цёмна-сіняга палатна, упрыгожвалі карункамі. Чапец мог быць часткай складанага галаўнога ўбору, калі на яго завязвалі хустку. У халодныя дні на плечы накідвалі хустку-ахінанку.

Мужчынская кашуля мела вышытую манішку з матывам васьміпялёсткавай зоркі ў сетцы з крыжыкаў. Характэрны матыў паясоў — стылізаваная выява дрэва, крыжыкі і трохкутнікі. У якасці галаўнога ўбору найбольшае распаўсюджанне меў картуз.

Мастоўскі раён

Адметны строй бытаваў у XIX — пачатку XX стагоддзя пераважна ў Мастоўскім, Шчучынскім і Зэльвенскім раёнах.

Жаночы комплекс складалі кашуля, спадніца з цёмна-сіняй даматканай тканіны, кроеная з шасці кліноў, або андарак з чатырох полак, пераважна чырвона-малінавага колеру ў вузкія гарызантальныя рознакаляровыя паскі; фартух з баваўнянай тканіны, аздоблены фальбонамі і карункамі; вязаная ў падоўжныя рознакаляровыя паскі безрукаўка; каптанік з ваўнянай тканіны ў клетку альбо катанка з белага ці шэрага валенага сукна, аблямаваная чорным аксамітам. Галаўныя ўборы жанчын — каптур, даматканая ці крамная хустка. Летні галаўны ўбор дзяўчат — круглы чапец, звязаны "сеткай" з баваўняных нітак.

Фота прадастаўлены Галерэяй рамёстваў "Ткалля"

МАЙ 2015

ПН	АЎТ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НДЗ
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	31

Брэстчына
Маларыцкі раён

Работа Сцепаніды Сцепанюк: выткаины вясельны ўбор нявесты і жаніха (на кадры ўнізе). Народная майстрыха працавала над ім больш як чатыры месяцы. Работа вялася па ўспамінах вяскоўцаў-старажылаў, а таксама — па фотаздымках. Маларыцкі арнамент выткаины белым шоўкам на белым палатне.

Майстрыха займаецца не толькі рэканструкцыяй строю, характэрнага для Маларытчыны. Сваім творчым абавязкам яна лічыць, так бы мовіць, адаптацыю традыцыі да сучасных умоў, стварае ўзоры касцюма ці яго элементаў (да прыкладу, мужчынскіх гальштукаў) для паўсядзённага карыстання.

ЧЭРВЕНЬ 2015

ПН	АЎТ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НДЗ
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30					

На здымках: Людміла і Андрэй Гарбацэвічы ў Маларыцкім строі; Іван Андрайчук і Наталля Пішчык у вясельных уборах жаніха і нявесты Маларытчыны пачатку ХХ стагоддзя, якія адноўлены і выткаины Сцепанідай Сцепанюк.
Фота Мікалая НАВУМЧЫКА і прадастаўленае аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Маларыцкага райвыканкама

Гродзеншчына

Лідскі раён

На Дар'і: кашуля на гэстцы, шчыльна сабраная на шыі. Каўнер-стойка, шырокія рукавы, уточаныя ў прамавугольную пройму на манжэце. Спадніца-андарак, саржавае палатно ў палоску, аднабаковая складка, ніз апрацаваны палоскай тканіны. Пояс — ткацтва на дошчачках (воўна).

На Надзеі: кашуля паліковага тыпу. Пярэдняя і задняя полкі злучаны па лініі пляча прамавугольнымі палікамі, шчыльна сабраная ля шыі, каўнер-стойка, рукаў — доўгі, шырокі на манжэце. Узор рукава-сонца, двухнітовае ткацтва, перабор у дошчачкі.

На Ірыне: кашуля на гэстцы, з грудніцай, па краі ўпрыгожанай зборкай. Ніз гэсткі аздоблены тканым узорам. Гарлавіна — стойка з уточанай па версе зборкай, рукаў — доўгі, шырокі на манжэце. Узор рукава: вёска Бабры Лідскага раёна, забіванка, двухнітовае ткацтва, перабор у дошчачкі. Пояс — ткацтва на дошчачках (воўна).

Фота прадастаўлены Гродзенскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці

Жаночая кашуля на гэстцы, з грудніцай, край якой упрыгожаны пасам тканіны са зборкай. Гарлавіна ўпрыгожана стужкай тканіны, што ўтварае зборку. Рукавы — шырокія, уточаныя ў прамавугольную пройму. Двухнітовае ткацтва (бавоўна, воўна). Арнамент на рукавах — пачатак XX ст., вёска Запрудзяны Воранаўскага раёна. Тэхніка — перабор у дошчачкі.

ЛІПЕНЬ 2015

ПН	АЎТ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НДЗ
		1	2	3	4	5
6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30	31		

Віцебшчына

Дубровенскі раён

У Дубровенскім строі пераважалі блакітныя фарбы і дробнаклятчастыя арнаменты ў паясных адзежынах.
Старадаўні жаночы касцюм складаўся з кашулі, спадніцы (андарака, саматканкі), ільнянога фартуха, спадніцы з прышыўным ліфам і поясам (саян — накшталт сукенкі без рукавоў). Святочную кашулю кроілі з прамымі плечавымі ўстаўкамі (палікамі), гэсткай; будзённую і споднюю — тунікападобнай. Аздабленне — паліхромнае: узорыстае ткацтва, вышыўка спалучаліся з разнаколернай аплікацыяй, аблямоўкамі, устаўкамі чырвонай або сіняй крашаніны ці кумачу. Чырвоны арнамент (строгія геаметрычныя формы, шматпялёсткавыя зоркі, раслінныя ўзоры) дапаўняўся блакітным, чорным, жоўтым, зрэдку — паскамі медна-чырвоных бліскавак.
Ніз спадніцы абавязкова абшываўся чырвонай стужкай. Дапаўнялі белым ці набіваным фартухом і поясам, на канцы якога нашывалі бісер, а разнаколерныя ніткі чаргавалі з саламянымі прожылкамі (крыглікамі). Жаночыя галаўныя ўборы — хусткі, чапцы.

Шумілінскі раён

Рэканструкцыя рэгіянальнага строю Шуміліншчыны канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Касцюм складаецца з палатнянай рубахі-касавароткі тунікападобнага крою з вышыўкай, "матузных" штаноў, вітога пояса з кутасамі, камізэлькі, саламянага капелюша, ботаў.

Фота прадастаўлены Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці.

ЖНІВЕНЬ 2015

ПН	АЎТ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НДЗ
					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23
24	25	26	27	28	29	30
31						

Віцебшчына
Лепельскі раён

У жаночым святочным касцюме лепельскага строю жанчыны-лепельчанкі хадзілі ў царкву, на кірмаш, яго апраналі ў святы. Арыгінал касцюма знаходзіцца ў фондах Лепельскага краязнаўчага музея. Жаночы касцюм складаецца з андарака (спадніцы) барвовага колеру ў палоску, фартуха, кашулі "на гэстцы" — яны белага колеру натуральнага адбеленага палатна, упрыгожаныя тканымі ўзорамі чырвонага колеру. Ва ўпрыгожванні фартуха выкарыстоўваецца характэрная для лепельшчыны тэхніка — "каляровая перавіць", карункі, вязаныя кручком. Важная дэталь касцюма — тканы пояс. Ён заўсёды прысутнічаў як у мужчынскім, так і ў жаночым касцюме. Лічылася, што менавіта пояс засцерагае ад сурокаў, з'яўляецца моцным абярэгам. Абавязковы элемент касцюма — галаўны ўбор. На Лепельшчыне ён называўся "кубак". Рабіўся з лубу, які абшывалі палоскай тканіны чырвонага колеру. Тканіна для ўсяго камплекту — саматканая. Яе выраблялі ў Доме рамёстваў на старажытных ткацкіх станках.

Фота прадастаўлены Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці

ВЕРАСЕНЬ 2015

ПН	АЎТ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НДЗ
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30				

Магілёўшчына

Касцюковіцкі раён

Народнае адзенне тэрыторыі Касцюковіцкага раёна фарміравалася на аснове старажытных культур крывічоў і радзімічаў. Пэўны ўплыў на дадзены працэс аказалі таксама асаблівасці адзення ўсходніх суседзяў — рускіх, і датычыцца гэта перш за ўсё таго, што андарак з кабатам (саян) вельмі падобныя на расійскі сарафан.

Традыцыйны народны жаночы касцюм Касцюковіцкага раёна ў 20-я гады XX ст. складаўся з вышытай сарочкі, андарака з кабатам (саяна), фартуха, галаўнога ўбору і абутку.

Сарочка (кашуля з геаметрычным арнаментам складае аснову жаночага касцюма. Рамбічныя і крыжаваныя фігуры вылучаюцца строгасцю ліній. Асноўная кампазіцыя вышыўкі размяшчаецца ў верхняй частцы рукава і паступова пераходзіць уніз.

Касцюм рэканструяваны спецыялістамі Цэнтралізаванай клубнай сістэмы Касцюковіцкага раёна.

Хоцімскі раён

Жаночы касцюм Хоцімскага раёна адносіцца да Краснапольскага строю. Ён складаўся з кашулі, саяна (спадніца з кабатам), фартуха, пояса, галаўных убораў і ўпрыгожанняў. Матывы і каларыт натыканага і нашыванага арнаменту кашуль не вызначаліся асаблівай разнастайнасцю складовых элементаў і колеравых градацый. Рамбічныя і крыжаваныя фігуры вылучаюцца строгасцю ліній і прамалінейнасцю контураў. Акрамя рамбічных фігур у геаметрычных узорах вышыўкі кашуль прысутнічаў матыў зоркі.

Касцюм рэканструяваны спецыялістамі Хоцімскай цэнтралізаванай клубнай сістэмы.

На фота, прадастаўленых Магілёўскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і культурна-асветнай работы: Святлана Яфрэмава, загадчык сектара мастацка-эстэтычнага выхавання, і Алена Хмялькова, вядучы метадыст установы

КАСТРЫЧНІК 2015

ПН АЎТ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НДЗ
		1	2	3	4
5 6	7	8	9	10	11
12 13	14	15	16	17	18
19 20	21	22	23	24	25
26 27	28	29	30	31	

ЛІСТАПАД 2015

ПН	АЎТ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НДЗ
						1
2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	29
30						

Магілёўшчына
Кіраўскі раён

У традыцыйны жаночы касцюм Кіраўскага раёна ўваходзілі сарочка (кашуля), спадніца з гарсэтам — саян, — хустка, абутак. Сарочка была вельмі падобная на кашулю, якую насілі ў Шклоўскім раёне (Магілёўскі строй). Сарочку, або кашулю, паліковага крою складалі з трох полак даматканага палатна. На рукаў ішла адна полка, месцы злучэння паліка і рукава былі азначаны, у асноўным, простым злучаным швом і састыкоўваліся арнаментам.

У комплексе прасочваюцца поўная суадноснасць частак па стылі: саяну адпавядае полкавая кашуля з акруглым выразам гарлавіны, якая афармлялася вузкай абшыўкай і фіксавала лішкі аб'ёму ў зборкі.

У Кіраўскім раёне спалучэнне чорнага і чырвонага колераў набывае асаблівую напружанасць. Устойліва захоўваецца схема размяшчэння дэкору па кашулі. Лінія плячэй абазначана вышытым арнаментам, які запаўняе ўсю верхнюю частку рукавоў.

Фота прадастаўлена Магілёўскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і культурна-асветнай работы

СНЕЖАНЬ 2015

ПН	АЎТ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НДЗ
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30	31			

Міншчына
Любанскі раён

Усе ўзноўленыя строі заснаваны на дэталёвым даследаванні і маюць этнаграфічныя арыгіналы. Захаваны традыцыйныя тэхнікі і тэхналогіі вырабу ды аздаблення, колеравай гамы і матэрыялаў. Навуковым кансультантам і натхняльнікам усёй працы стаў Сяргей Выскварка — загадчык арганізацыйна-творчага аддзела Любанскага раённага цэнтра культуры.

Вясельны строй вёскі Шыпілавічы: узноўлены комплекс адзення пад назвай "Бабуліна радасць". Ён выраблены ў 2011 г. па ўспамінах бабулі і ўяўляе з сябе вясельны строй вёскі Шыпілавічы. Дарэчы, Наста Кухарэнка (на фота) выканала яго да свайго вяселля. У камплекце — андарак з тканіны, выраблена на кроснах па старых абразках, кашуля, фартух і намітка з пакупнога лёну, вышытыя процягам, два тканыя на бердзечку паясы, гарсэт з ваўнянай тонкай тканіны, дзве хусткі і кісет, а таксама нізка караляў. Да поўнага вясельнага строю не хапае толькі вянка. Па традыцыі яго робяць (шыюць) сяброўкі нявесты за тыдзень да вяселля.

Фота прадастаўлены Мінскім абласным цэнтрам народнай творчасці

На гарадское дабрачыннае свята ў рамках акцыі "Нашы дзеці" ў Белдзяржцырк былі запрошаны **1,5 тысячы дзяцей**.

Беларускі народны каляндар на 2015 год

24. н. ****Сёмуха, Зыход Святога Духа.* Свята зелені. **Макей.** "Мокра на Макея — і лета не прасушыць". **Кірыла і Мяфод.** Калі дзень мокры — і лета будзе мокра.

25. п. Епіфан. "На Епіфана раніца ў чырвоным каптане, неба з барваю — гарачае лета".

27. с. Сідары. "Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сіверы". ***Градавая серада.**

28. ч. Пахом. "Святы Пахом павее цяплом". "Сей агуркі на Пахома — будзеш насіць мяхом".

29. пт. *Магдалена.* Зязюльку прысылае. ***Сёмушныя Дзяды.**

30. сб. *Духавая субота, Зялёная субота. "На Духа будзе цёпла і суха".

31. н. *Сёмуха, Тройца. Культ продкаў і расліннасці. "Павядзём Куста пад гай зялёненькі...". **Шэсць дзеў.** "Лён сей позні". **Канапелька Матруна.** "У зямлю махнула". **Фядот.** "Як на дубе апушка — у Фядота поўна аўса кадушка".

ЧЭРВЕНЬ

1. п. *Русальніца, Іван ды Мар'я. Праводзіны вясны. "На Граннай нядзелі Русалкі сядзелі...".

2. а. *Конскі Вялікдзень. Свята коней. **Тры пакутнікі.** "Няма лета, але пасля іх не бывае зімы".

3. с. Алёна, Ульяна. Дзень ільну. ***Градабой, Серада Русаль.** Здабывалі з ясеня святы агонь.

4. ч. *Божае цела, Зелянок. *Наўская Тройца. Памінанне.

29. п. Ціхан. "Пеўчыя птушкі заціхаюць". ***Пятрок.** "Да Пятра зязюльцы кукаваці". "Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілья — ападуць і два".

ЛІПЕНЬ

6. п. Купалле. Свята Сонца і кахання. "Дня адбаўленне, ночы прыбаўленне".

7. а. Іван Купала. "Учора была Купала, а сёння — Іван".

10. пт. Самсон. "На Самсона дождж — сем тыдняў то ж". ***Сем братоў.*** "Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды".

12. н. Пятро. Свята заканчэння Купалля.

13. п. Паўпятро. Дзень талакі. **Сымон і Юда.** "На Сымана й Юды конь баіцца груды".

14. а. Кузьма і Дзям'ян. Свята кавалёў. "Святы Пятро жыта спеліць, святы Кузьма сярпы робіць, а святы Дзям'ян сена грабе".

17. пт. Андрэй. "Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма". "Андрэй усіх мудрэй".

18. сб. Свята Месяца. "Месяц гуляе".

21. а. Казанская. Пракоп. Пракоп бок прыпёк. ***Данат.*** "Святы Данат коскі точыць".

25. сб. Прокл. Засцерагаліся вялікіх рос. ***Якуб.*** "На Якуба хлеба поўна губа".

26. н. Гаўрылей. Засцеражэнне ад граду. ***Ганна.*** Снапы кладзе.

29. с. Афінаген. Заціхаюць птушкі.

29. сб. Трэці Спас. Свята хлеба. **Ян.** "Ян на лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў".

30. н. Міроны Ветрагоны. "Пыл па дарозе гоняць, па прыгожым леце стогнуць".

31. п. Флор і Лаўр. Свята коней. **Арабінавыя дзень і ноч.** "Сухая" навальніца, дождж.

ВЕРАСЕНЬ

5. сб. Лупа. "Сей на Лупа — будзе жыта купа".

7. п. Баўтрамей. "Жыта на зіму сей".

8. а. *Другая Прачыстая.* "Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста".

10. ч. Мацей. Абаронца ад п'янства.

11. пт. Калінавік, Іван Крыўнік.

13. н. Кіпрыян. Журавель збіраецца ў вырай.

14. п. Сымон. Абрад "жаніцьбы коміна". (Асенняе Навалецце з 1493 г.) Закрыванне зямлі. **Бабіна лета. Узвіжанне.**

19. сб. Цуды, Міхал. "Міхал з поля спіхаў".

21. п. Багач, Нараджэнне Божае Маці. Свята заканчэння ўборкі зерневых. Засідкі.

23. с. *Асенняе раўнадзенства. Усход — 6.01, захад — 18.01.*

24. ч. Тадора. "На Тадору ўсякае лета заканчваецца".

26. сб. Стаўроўскія Дзяды.

27. н. Звіжанне. Свята закрывання зямлі на зіму. Гадзюкі — у кучу.

ЛІСТАПАД

1. н. *Дзень Усіх Святых.* Памінальны дзень.

2. пн. *Задушны дзень.* Памінальны дзень.

4. с. Казанская. Дождж ці снег.

7. сб. Асяніны, Змітраўскія Дзяды. "Святыя дзяды, завём вас...".

8. н. Зміцер. "Да Змітра дзеўка хітра".

9. п. *Тодар.* "На Тадора поўна камора".

10. а. Параскі. Апякунка жанчын і рукадзелля.

11. с. Настуся. Настуся стрыжэ авечкі. ***Марцін.*** "Мядзведзь кладзецца ў бярлогу".

12. ч. Артошка. Пачатак прадзення.

14. сб. Кузьма-Дзям'ян. Апякун земляробства, кавалёў і вяселля.

21. сб. Міхайлаў дзень. Абаронца ад грому. Мядзведзі ідуць у спячку.

22. н. Матрона. "З Матроны становіцца зіма".

24. а. Хвёдар Студзянец. "Хвёдаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць".

25. с. Іван Міласцівы. Дзень падарункаў. ***Кацярыны.*** "Кацярына забрала лета".

27. пт. Юстыніян. Апякун плоднасці і дзяцінства. **Піліп.** Пярэдадзень Піліпоўскага посту (да 7 студзеня).

28. сб. Піліпаўка — перадкалядны пост.

***Аблiваха. Васіліск.** "Ад Васіліска і салавей блізка".

5. пт. Дзень Ефрасінні Полацкай. Хадзілі пакланіцца і абракацца.

7. н. Ян. "Рой перад Янам — пчаляр панам". ***Русальчыны розыгры.** Засцерагаліся рос.

8. п. *Пятроўка да 11 ліп. Пятроўскі пост. Пятроўка-галадоўка.

11. ч. *Дзявятнік. Перавод уніятаў у праваслаўе. "Дзеўяць ягодзін на ветцы".

12. пт. *Дзевятуха. Дзень ад навальніцы.

13. сб. Ерамей. *Антоній.* "Антоні, аддай коні".

14. н. Юстын і Харытон. "Юстын цягне ўверх каноплі, а Харытон — лён".

16. а. Лук'ян. Паўднёвы вецер на Лук'яна — на добры ўраджай яравых.

18. ч. *Дзясятнік. "Дзясятнік гнаі возіць".

19. пт. *Дзясятка. "Косы точыць". "Жыта паспявае".

20. сб. Да 23 — *летняе сонцастаянне. Даўжыня дня — 16.52. Усход — 3.45, захад — 20.37.*

21. н. Тодар. "На Тодара раса — канапель паласа".

22. п. Кірыла. Дзень сонцастаяння. Пачыналі касавіцу ў Паазер'і.

23. а. *Купала.* У старажытн. — Новы год/лета.

24. с. *Ян Купальны.* "Сонца грае".

25. ч. Анапрэй. "Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ".

26. пт. Акуліна Грачышніца. Сеялі грэчку. **Задзярыхвост.**

28. н. Амос. "Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс".

Пачатак народнага календара **чытайце на старонцы 2.**

31. пт. Серпавіца, Шыпілінка (пятніца перад Ільёй). Дзень "зазубрывання" сярпоў.

ЖНІВЕНЬ

1. сб. Макрыны. "Глядзі восень па Макрыні".

2. н. Ілья. Свята дажджоў і навальніц. "Ілья нарабіў гнілля"; "Ілья ўкінуў у воду кусок ільда".

4. а. Мар'я. "Магдалена — вады па калена".

6. ч. Барыс Палікоп. "Барыс і Глеб — паспеў хлеб".

7. пт. Ганны. "Святы Ганны бабкі стаўляюць".

9. н. Палікоп. Паліць копы. **Панцеляймон.** Вылечваў ад хвароб галавы.

11. а. *Лаўрын.* "На Лаўрына спяшай да млына".

12. с. Сіла. "Жыта сей".

14. пт. Макавей, Першы Спас. Свята маку і мёду. **Спасаўка.** Пост да 28 жніўня.

15. сб. Базыль. "Базыль авечкам воўну дае". ***Прачыстая, Зельная.*** "Прыйшла Прачыста — стала поле чыста".

16. н. Антоны Віхравеі. Рох. "Кірмаш на паненак".

17. пн. Еўдакія. Агуркі збірае.

19. с. Яблычны Спас. Свята садавіны.

23. н. Лаўрэн — свята млынара.

24. п. *Баўтрамей.* "Святы Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей"; "Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей".

27. ч. Міхей. Выспяваюць брусніцы.

28. пт. Прачыстая. Свята ўраджаю.

29. а. Міхал. "Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на надвор'е надзеі". **Сіцыян.** "Святы Сацыян да ляны пасцілаў".

КАСТРЫЧНІК

2. пт. Зосім. Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць.

3. сб. Астап, Астаф'я. Прыкметы па ветры.

4. н. *Пранцішак, Францішак.* "На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка".

8. ч. Сяргей. Жалезны тыдзень.

9. пт. Іван Шаптун, Іван Кураед, Багаслоў. Шапталіся свахі пра нявест.

14. с. Пакровы, Трэцяя Прачыстая. Вясельная пара. "Свята Пакрову, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам!"; "Пакровы — зарыкалі каровы". **Дзявоцкае лета** (па 21 кастрычніка). Прымалі "ў дзеўкі" сяброўак.

21. с. Трыфан, Палагея. "Золкім ветрам вее". ***Зміцер.*** "Да Змітра баба хітра".

25. н. Марцін — свята млынароў.

28. с. *Сымон і Юда.* "Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць". ***Параскева Пятніцкая.*** Забарона на прадзенне.

29. ч. Лонгін. Збавіцель ад хвароб вачэй.

30. пт. Паклоны. Дзень адбівання паклонаў.

31. сб. Лука. "Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі". Дзень іканапісцаў. ***Юльян*** — ахоўнік дзяцей.

29. н. Мацей. "На Мацея зіма пацее". ***Адвент.*** Перадкалядны пост.

30. п. *Андрэй*. Дзявочае свята.

СНЕЖАНЬ

4. пт. Увядзенне. Водзяцца ваўкі. ***Барбара.*** "Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла".

5. сб. Пракоп. *Савы.* "Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае".

6. н. Матрыхваны. Не пралі. ***Мікола.*** "Хвалі зіму па Міколе".

7. п. Кацярыны. "Забрала край лета".

9. с. Юр'е Зімовы. Юра мосціць. ***Ганны.*** "Ад Ганны да Каляд два тыдні і два дні".

13. н. Андросы, Андрэйкі. Варажылі.

14. пн. Навум. Наставіць на вум.

17. ч. Варвары. "Мікола і Варвара ноч урвалі".

18. пт. Савы, Міколін бацька. "Сава мосце, а Мікола гвоздзе".

19. сб. Мікола Зімовы. "Без Міколы не бывае ні зіма, ні лета". "Мікола марозам гвоздзіць".

22. а. Ганны. "Ганкі — сядайце на санкі".

24. ч. *Посная куцця.* Пачатак Каляд (да 6 студзеня).

25. пт. Спірыдон Сонцаварот. *Божае Нараджэнне.*

26. сб. *Сцяпан.* "Кожны сабе пан".

31. ч. Марк. "Марка да Варка — няхай будзе парка". ***Багатая куцця. Сільвестр.*** Дзяўчаты варажылі.

Алесь ЛОЗКА,
фалькларыст

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст." .
- "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.".
- "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.".
- "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
- "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст." .

Выстаўкі:
- Выстаўка твораў Марыі і Мікалая Ісаёнкаў **"Двое пад адным дахам"** — да 26 студзеня.
- Выстаўка **"Выратаваныя каштоўнасці"** — да 12 лютага.
- Выстаўка **слуцкіх паясоў** са збору Нацыянальнага музея ў Варшаве — да 6 красавіка.
- Выстаўка, прысвечаная 75-годдзю музея, **"Мастацтва рэстаўрацыі. Магія майстэрства"** — да 12 лютага.
- Выстаўка аднаго твора: акварэль **"Паляўнічыя на рацэ з забітым ласём"** Юліяна Фалата — да 5 студзеня.
- Арт-праект **"Дрыяды"** (Ганна Герт, Дар'я Палуян, Ала Свірыдзенка, Надзея Сліжэўская): фота, авангардныя касцюмы і аўтарскія ўпрыгожанні — да 12 студзеня.
- Выстаўка жывапісу і графікі Сяргея Кухто **"Віцебскі кентаўр"** — да 19 студзеня.
- Праект **"У Новый год з Музеем!"** — жывапіс і народная творчасць, звязаныя з зімовымі святамі, Веры Салдатавай, Кацярыны Русаковіч, Веры Гаўрылюк, Тацяны Чарныш, Анатоля Волкава і Наталлі Залознай.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
- "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
- "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
- "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

- Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст.".**

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 00 05.

Экспазіцыі:
- "Старажытная Беларусь".
- "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
- "Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".

УВАГА! / ІДЗЕ ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

- "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Музей шакаладу "Nikolya"** — да сакавіка.
- Выстаўка **"Музей ёлачных цацак"** — да 15 лютага.
- Выстаўка аўтарскай лялькі **"Спадарыня лялька"** — да 1 лютага.
- Выстаўка твораў Яўгена Ждана і Аляксандра Рашэтнікава **"Грані натхнення"** — да 15 лютага.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а.
Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыя:
- "Мінск губернскі ў канцы XIX — пачатку XX стст.".
- "І З'езд РСДРП у асобах".
- "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
- "Гісторыя Дома-музея І З'езда РСДРП".

Выстаўкі:
- **"Васковыя фігуры"** і **"Аўто на далоні"** — да 1 лютага.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка **"Гісторыя і сучаснасць беларускага хакея"** — да 31 студзеня.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:
- "Геалогія і палеанталогія".
- "Сезонныя змены".
- "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
- "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
- "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
- "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".

Выстаўка:
- **"Экзатычны свет"** — да чэрвеня.

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9А.
Тэл.: 237 46 94.
- Выстаўка **"Велізарныя цмокі"** — да 1 лютага.

г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 151/1.
Тэл.: 291 99 51.

Экспазіцыі:
- "Жывёльны свет Беларусі ў сезоннай дынаміцы".
- "Каляводныя жывёлы".
- "Птушкі нашага горада".

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:
- "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".

Выстаўка:
- Персанальная юбілейная выстаўка мастака-пастаноўшчыка, ветэрана беларускага кіно Уладзіміра Чарнышова **"У гэтым шалёным і цудоўным свеце"** — да 19 студзеня.

Кінапраграмы:
- Мультыплікацыйная рэтра-праграма **"Зімовыя прыгоды"** — з 3 да 31 студзеня.
- Рэтраспектыва, прысвечаная 95-годдзю кінаактрысы Мішэль Морган, **"Самая французская"** — з 6 да 29 студзеня.
- Рэтраспектыва **"Кінаметафары Федэрыка Феліні"** — з 9 да 31 студзеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:
- "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
- "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
- "Беларуская музычная культура XX ст.".
- "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".

Выстаўка:
- Выстаўка па выніках конкурсу **"Калядныя замалёўкі-2014"** — да 30 студзеня.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14.
Тэл.: 286 74 03.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка да 75-годдзя мастака-пастаноўшчыка кінастудыі "Беларусьфільм" Уладзіміра Чарнышова **"За парталам сцэны"** — да 6 лютага.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўка:
- Міжнародны выставачны праект з Музея Арміі (Стакгольм, Швецыя) **"Рэчы паміж жыццём і смерцю"** — да 25 студзеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка **"Вялікая і забытая"**, прысвечаная Першай сусветнай вайне, — да 18 студзеня.

Ратуша
- Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка **"Партрэты князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"** — да 16 лютага.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра".**
- Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
- Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.

Акцыі:
- **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
- Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
- Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:
- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
- Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
- **"Калядкі ў Купалавым доме"** — да 6 студзеня (папярэдні запіс абавязковы).

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10.
Тэл.: 321 24 30.

- Выстаўка скульптуры Уладзіміра Жбанава **"Ад мяне"** — да 31 мая.
- Выстаўка **"Мінск на старых паштоўках"**.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
- **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
- **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выстаўкі:
- Выстаўка твораў Андрэя Смаляка **"Жыццё. Жывапіс. Каханне"** — да 19 студзеня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстаўка:
- Выстаўка **"Gloria Patria"** — дакументы, карты, прадметы хрысціянскага культу з прыватнай калекцыі Ігара Сурмачэўскага — да верасня.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
- Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
- **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры к. XIX — с. XX стст.

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, пр-т Ракасоўскага, 49.
Тэл.: 291 16 76.

Экспазіцыі:
- **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Л.Шчамялёва".**

Выстаўка:
- Выстаўка акварэлей і графікі Эдмунда Вялічкі **"Азірніся"** — да 17 студзеня.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.

Выстаўка:
- **"Доблесць і слава. Даспехі і ўзбраенне XVI — XVII стст."** — да 1 сакавіка.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- Унікальны выставачны мега-праект Руслана Вашкевіча **"Ідзі і глядзі"** — да 25 студзеня.
- Выстаўка **"Навагоднія гісторыі"** — да 1 лютага.
- Фотавыстаўка **"Гомельскі палац і мастацкія калекцыі Паскевічаў са збору Дзяржаўнага Эрмітажа"** — да 31 студзеня.
- Выстаўка **"Новае ў археалогіі Гомельшчыны"** — да 27 лютага.

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня".**
- **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:
- **"Гісторыя ў пісьмёнах"** (факсімільныя выданні старажытнарускіх летапісаў з аддзела рэдкай кнігі Гомельскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна) — да 31 студзеня.
- **"Рэтра-Гомель"** — да 31 студзеня.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстаўкі:
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад
- Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

- Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна..."**.
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!"**.
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
- Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.
- **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
- Выстаўка **"Чарадзейны куфар"**.
- Персанальная фотавыстаўка Алены Кавалёвай **"Дзень, які натхніў"**.

ЛІДСКІ ЗАМАК

- Камера катаванняў.
- Фотавыстаўка **"Захаваем на вякі".**
- Партрэтная галерэя вялікіх князёў і каралёў.
- Фотавыстаўка **"Археалагічныя знаходкі Лідскага замка"**.
- Выстаўка рэплік **"Зброя Вялікага Княства".**

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

- Рэспубліканская мастацкая выстаўка **лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў** фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі — да 17 студзеня.

УВАГА!
ТУТ МАГЛА Б БЫЦЬ ВАША АФІША!
Звяртайцеся:
+375 17 286 07 97,
+375 17 334 57 41 (факс);
kultura@tut.by

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.

- **3, 6, 10 — "Шчаўкунок"** П.Чайкоўскага (спектакль Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа). Пачатак а 12-й.
- **3 — "Яўгеній Анегін"** (опера ў 3-х дзеях) П.Чайкоўскага. Пачатак а 19-й.
- **4 — "Жар-птушка"** (прэм'ера) І.Стравінскага. Пачатак а 12-й.
- **4 — "Жар-птушка"** І.Стравінскага; **"Шапэніяна"** Ф.Шапэна; **"Палавецкія скокі"** А.Барадзіна. Пачатак а 19-й.
- **6 — "Чароўная флейта"** (опера ў 2-х дзеях) В.-А. Моцарта.
- **8, 10 — "Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага. Пачатак а 19-й.
- **8 — "Дзявочая субота"** (Аднойчы ў Калядную ноч). Пачатак у 19.30.
- **9 — "Снягурка"** (опера ў 2-х дзеях) М.Рымскага-Корсакава.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7.
Тэл./факс: 327 60 81.

- **3 — "Паўлінка"** Янкі Купалы.
- **4, 6 — "Ноч на Каляды"** паводле М.Гогаля.
- **8 — "Офіс"** І.Лаўзунд.
- **9 — "Чорная панна Нясвіжа"** А.Дударава.
- **10 — "Пан Тадэвуш"** А.Міцкевіча.

На Малой сцэне Канцэртнай залы "Мінск"
- **8 — "Гендэль Бах"** П.Барца.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

- **3, 4, 6 — "Усе мышы любяць цырк"** В.Буслаевай. Пачатак а 12-й.
- **4 — "Адамавы жарты"** С.Навуменка. Пачатак а 19-й.
- **8, 9 — "Нямое каханне"** — аўтарскі праект Ігара Сігова.
- **10 — "Два чароўныя парасоны (Стойкі алавяны Салдацік)"** С.Навуменка. Пачатак а 12-й.
- **10 — "Нязваны госць"** С.Бартохавай. Пачатак а 19-й.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

- **3, 4 — "Марозка"** У.Баскіна. Пачатак аб 11-й і а 14-й.
- **3 — "Тысяча і адна ноч"** (аперэта ў 2-х дзеях) Ф.Амірава.
- **4 — "Соф'я Гальшанская"** У.Кандрусевіча.
- **5, 6 — "Навагодні пярэпалах у казачным каралеўстве"** А.Атрашкевіч. Пачатак аб 11-й і а14-й.
- **5 — "Блакітная камея"** (спектакль ідзе без аркестра) К.Брэйтбурга.
- **8 — "Шчаўкунок"** (балет у 2-х дзеях) П.Чайкоўскага. Пачатак а 19-й.
- **9 — "Юнона" і "Авось"** А. Рыбнікава.
- **10 — "Шалом Алейхем! Мір вам, людзі!"** А.Хадоскі.